УДК 271.2

# УТВАРЭННЕ ДАМІНІКАНСКАГА ОРДЭНУ Ў РЭЧЫШЧЫ РЭАКЦЫІ КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ НА ЕРЭТЫЧНЫЯ РУХІ

**© 2014 К. С. Гардун**

*cyrilgordun@mail.ru*

*Студэнт 4 курса Мінскай духоўнай семінарыі*

Дадзены артыкул прысвечаны агляду ўмоў існавання заходняга хрысціянскага свету ў XII ст., якія прывялі да ўсталявання новага ордэну. Захады папства па рэфармаванні царкоўных інстытутаў для барацьбы з новымі павевамі, што падрывалі царкоўную арганізацыю і прыводзілі да страты яе ўплыву на пэўных абшарах Еўропы, не заўсёды былі дзейснымі. Выключна сілавыя метады барацьбы, якія апіраліся на свецкія ўлады і крыжаноснае войска, выклікалі толькі з’яднанне праціўнікаў і шырокі негатыўны рэзананс у тагачасным грамадстве. Скліканне IV Латэранскага сабору павінна было пакласці пачатак не толькі абнаўленню царкоўнай арганізацыі, але і формы рэагавання на грамадскія рухі. У артыкуле адведзена важнае месца асобе Дамініка дэ Гусмана, які адыграў выключную ролю ў станаўленні новага манаскага ордэну, мэтай якога была якраз барацьба з ерасью.



Даследванне праблемы ўзнікнення ў перыяд сярэднявечча манаскіх жабрацкіх ордэнаў мае вялікае значэнне як у гісторыі краін і народаў, так і ў гісторыі каталіцкай царквы. Распрацоўка гэтай тэмы з’яўляецца актуальнай ужо таму, што многія са створаных тады ордэнаў існуюць і зараз. Канешне ж, іх метады і задачы зазналі змены, але галоўная мэта засталася колішняй— падтрымка каталіцкай царквы. Таксама немалаважным з’яўляецца тое, што і да цяперашняга часу яна не перастае займаць значнае месца ў жыцці многіх дзяржаў.

Пачатак вывучаемай эпохі – XIII ст. – час росквіту шэрагу сярэднявечных інстытутаў. Росквіт манаства, росквіт папскай магутнасці, схаластыкі, ерэтычных рухаў. У гэтую эпоху ў палітыцы, грамадскіх працэсах, рэлігійным светапоглядзе, формах арганізацыі духоўнага і інтэлектуальнага жыцця — паўсюдна старыя, здавалася б, назаўсёды ўсталяваныя нормы і каштоўнасці страчвалі свае пазіцыі і падвяргаліся перагляду. Адбывалася гэта не столькі пад уздзеяннем новага культурнага стандарту, характарызуемага як культура Рэнесансу, колькі знутры старога ўкладу жыцця, веры і думкі.

Дэградацыя і крызіс афіцыйнай, да краю фармалізаванай царкоўнай іерархіі вялі на фоне скептычных адносінаў да папскай епіскапскай улады не да крызісу каталіцызма ў цэлым, але да росту персанальнай набожнасці і з’яўлення новых форм народнай рэлігійнасці. Па-за і незалежна ад царкоўных улад, шырока распаўсюджваліся

разнастайныя формы «нізавой», народнай рэлігійнасці, якая знаходзіла сваё выражэнне ў містыцы і набожнасці пакаяння і малітвы, у рэлігійных брацтвах і рухах (з пазіцыі царкоўных улад не заўсёды паслядоўна артадаксальных), да якіх прымыкалі як мужчыны, так і жанчыны, як простыя бюргеры, так і адукаваныя манахі і нават выпускнікі лепшых еўрапейскіх універсітэтаў.

Апісаныя працэсы запатрабавалі рэакцыі царквы, як з боку іерархіі, так і з боку нізавога святарства і прыхаджан. Здольнымі адказаць на выклік часу аказаліся Францыск і Дамінік. Іх ідэі, іх бачанне хрысціянскага жыцця і напрамкі яго адраджэння найбольш упэўнена і адначасова тонка ўлавілі пульс эпохі і патрэбы грамадства. У рэчышчы нашай тэмы найбольшую цікавасць выклікае фігура св. Дамініка і яго дзейнасць.

Найбольш каштоўнай крыніцай пра жыццё Дамініка дэ Гусмана з’яўляецца праца Іардана Саксонскага «Libellus de initiis ordinis praedicatorum» (Кніжыца аб заснаванні ордэна прапаведнікаў). Гэтае сачыненне з’яўляецца найбольш поўнай крыніцай, якая ў далейшым аказала значны ўплыў на ўсе наступныя творы, прысвечаныя ордэну, так як аўтар з’яўляецца сучаснікам Дамініка і нават сустракаўся з ім асабіста, да таго ж пры яго жыцці было шмат братоў-прапаведнікаў, якія зналі Дамініка, з якімі Іардан не раз сустракаўся. А пазнаёміўся Іардан Саксонскі з Дамінікам, калі выкладаў тэалогію ў Парыжы ў 1219 г. і ўжо 1222 г. быў абраны генеральным магістрам.

Наступнай крыніцай, якая тычыцца дадзенай тэмы, з’яўляецца Канстытуцыя ордэна. Адзінай копія, паколькі яна існавала да выпраўленага выдання Раймунда дэ Пеньяфортэ, якое ўступіла ў сілу ў 1241 г., з’яўляецца рукапіс манастыра ў Радэ, Францыя. Зараз яна знаходзіцца ў архівах манастыра Санта Сабінэ ў Рыме, на сёння рэзідэнцыі ордэна дамініканцаў. Яна датуецца сярэдзінай чатырнаццатага стагоддзя і з’яўляецца копіяй арыгінальнага тэксту трынаццатага стагоддзя.



Канстытуцыя з’яўляецца незамянімай крыніцай, якая апісвае жыццё дамініканскіх манастыроў з самага ранку і да позняга вечара. Другая частка падрабязна распавядае аб прынцыпе падзелу ўлады ў ордэне і яго структуры.

Каштоўнымі гістарычнымі даследваннямі пры вывучэнні дадзенай тэмы з’яўляюцца работы І. Р. Грыгулевіча «Інквізіцыя»[1] і Г. Ч. Лі «Гісторыя інквізіцыі ў сярэднія вякі»[2]. Абедзве кнігі даюць падрабязнае апісанне этапаў устанаўлення інквізіцыі, яе метадаў, кіраўнікоў, асаблівасцей яе правядзення ў розных краінах у перыяд сярэднявечча і новага часу.

Агульныя працы па гісторыі царквы нам могуць дапамагчы (напрыклад, Йозеф Лортц «История Церкви, рассмотренная в связи с историей идей»[3]), яны ўтрымліваюць

[1] Григулевич, И. Р. Инквизиция / И. Р. Григулевич. – Москва, 1985. – 448 с.
[2] Ли, Г. Ч. История инквизиции в средние века / Г. Ч. Ли. – Т. I. – Москва, 1911 – 210 с.
[3] Лортц Йозеф. История Церкви, рассмотренная в связи с историей идей / Йозеф Лортц. В 2-х т. – Москва, 1999.

панараму духоўнага жыцця таго часу, што не дазваляе пры вывучэнні выпасці з кантэксту эпохі.

Класічныя працы па гісторыі дамініканскага ордэна: Лакардэр Г. П. «Жизнь святого Доминика»[4]; Ли Г. Ч. «История инквизиции. Происхождение и устройство»[5] – даюць каштоўны і падрабязны матэрыял, але амаль выключна аб дзейнасці св. Дамініка, дзейнасць ордэна як сістэмы, тым больш на пэўнай, нам патрэбнай тэрыторыі асвятляецца мімаходзь. Праца Бейджент М., Ли Р. «Цепные псы церкви. Инквизиция на службе Ватикана»[6] таксама можа лічыцца класічнай, але яна з-за сваёй палітызаванасці і тэндэнцыйнасці пакутуе на залішнюю публіцыстычнасць.

Каштоўныя звесткі пра адносіны дамініканцаў з папскай уладай утрымліваюцца ў даследванні: Лозинский С. Г. «История папства»[7].

## ЗАСНАВАННЕ ОРДЭНУ ДАМІНІКАНЦАЎ. ДАМІНІК ДЭ ГУСМАН І ЯГО ОРДЭН БРАТОЎ-ПРАПАВЕДНІКАЎ

У XIII ст. з'яўляюцца два новыя ордэны: ордэн францысканцаў і ордэн дамініканцаў. Абодва былі заснаваны як жабрацкія і прапаведніцкія, а таму ў аснову асноў ставілі строгае выкананне зароку беднасці і місіянерскае служэнне. Аднак пераемнасць паміж новастворанымі жабрацкімі ордэнамі і старымі формамі манаства, а таксама жыццём статутных канонікаў была вельмі адчувальнай. Рызыкуючы заслужыць папрок у залішнім спрашчэнні, мы можам усё ж такі сказать, что францысканцы прыстасавалі да новых патрэб бенедыктынскую форму манаства, тады як дамініканцы скарысталіся манастырскімі статутамі прэманстрантаў, паставіўшы ў цэнтр гэтых статутаў руплівае і дакладнае вывучэнне свяшчэннай ісціны, якое адрознівала канонікаў св. Віктара.



Жабрацкія ордэны, аднак, явілі сабой не проста развіццё форм манаскага жыцця; іх значэнне гэтым не вычэрпвалася, у іх знайшлі сваё выражэнне жыццёвыя патрэбы Царквы: патрэба звароту да жыцця паводле Евангелля (vita apostolica); неабходнасць рэформы манаскага жыцця; асабліва ў вобласці выкананння зароку беднасці; неабходнасць выкаранення з'явіўшыхся ерасей; патрэба павышэння ўзроўню епархіяльнага духавенства; неабходнасць прапаведніцтва і ажыццяўлення таінстваў дзеля задавальнення патрэб вернікаў. Усё гэта асабліва адрознівала дамініканцаў, свядома і адназначна накіраваных на вырашэнне праблем свайго часу і на развіццё новага багаслоўя—схаластыкі. Францысканцы больш прытрымліваліся традыцыі старажытнага манаства і імкнуліся вярнуцца да прастаты і беднасці.

[4] Лакордер, Г. П. Жизнь святого Доминика / Г. П. Лакордер. – Москва, 1915 – 302 с.
[5] Ли, Г. Ч. История инквизиции. Происхождение и устройство / Г. Ч. Ли. – Москва, 2001. – 276 с.
[6] Бейджент, М.; Ли, Р. Цепные псы церкви. Инквизиция на службе Ватикана / М. Бейджент, Р. Ли. – Москва, 2006. – 251 с.
[7] Лозинский, С. Г. История папства / С. Г. Лозинский. – Москва, 1986. – 382 с.

Перш чым гаварыць пра заснаванне ордэна братоў-прапаведнікаў, трэба пачаць з яго заснавальніка. Гэтым чалавекам быў Дамінік дэ Гусман. Ён нарадзіўся ў кастыльскім мястэчку Калеруэга ў 1170 г. Хаця, хутчэй за ўсё, бацькі, Феліс дэ Гусман і Хуана дэ Аса, нягледзячы на сцверджанні некаторых біёграфаў Дамініка, не былі звязаны з кіруючым кастыльскім домам. Паводле падання, маці Дамініка, будучы цяжарнай, у сне ўбачыла будучае дзіця ў выглядзе сабакі з факелам у пашчы; для заспакаення яна накіравалася да магілы каталіцкага святога Дамініка Сілоскага. Удзячнасцю за падараванае заспакаенне было імя, якое атрымаў сын— Дамінік, а выява сабакі з факелам потым стала сімвалам дамініканцаў. Купель, у якой быў ахрышчаны Дамінік, служыла ў далейшым для хрэсьбінаў каралеўскай сям'і Кастыліі.

У шасцігадовым узросце Дамінік быў адданы дзядзьку па мацярынскай лініі, архіпрасвітару царквы ў Гум'ель-дэ-Ісан бліз Калеруэгі. З 1184 г. Дамінік вучыўся ў горадзе Паленсія, у адзіным тады на тэрыторыі Іспаніі ўніверсітэце, вывучаў «свабодныя мастацтвы», а затым тэалогію. Згодна ордэнскаму паданню Дамінік вылучаўся набожным ладам жыцця. У 1191 г., падчас голада ў Кастыліі, ён прадаў кнігі, забяспечаныя ўласнаручнымі глосамі, для таго, каб выратаваць ад галоднай смерці паленсійскіх беднякоў. Біёграф Іардан Саксонскі паведамляе, што Дамінік двойчы спрабаваў прадаць сябе ў рабства для таго, каб на ўтаргаваныя грошы выкупіць ў маўраў палонных хрысціян. Пасля завяршэння вучобы ў 1194 г. Дамінік чытаў у Паленсіі лекцыі аб Свяшчэнным Пісанні.



У 1196 або 1197 гг. Дамінік па просьбе епіскапа Осмы Марціна дэ Басана, стаў членам сабарнага капітула рэгулярных канонікаў Осмы ў вобласці Буран (Кастылія), там быў рукапаложаны ў святара і стаў памочнікам супрыёра канонікаў-аўгусцінцаў кафедральнага капітула, а пасля супрыёрам. Там ён пачаў прапаведніцкую дзейнасць. Пасля смерці Марціна дэ Басана (1201) епіскапам стаў прыёр капітула Дыега дэ Асэведа, якога ў 1203-1204 гг. Дамінік суправаджаў у паездках у Данію (на епіскапа было ўскладзена правядзенне перамоў аб жаніцьбе сына кастыльскага караля Альфонса IX Фернанда на дацкай прынцэсе)[8].

У паездках у свіце свайго біскупа Дыега дэ Асэведа сутыкнуўся з тамтэйшым поспехам катараў. Катарызм на глебе аскетычнага ладу жыцця і аратарскай сілы пераканання знайшоў вялікі водгук у насельніцтва. Мясцовымі феадаламі катарызм быў цярпімы і падтрыманы, у той жа час каталіцкаму духавенству было не да турбот духоўных, яно было больш заклапочана забеспячэннем мірскіх прывілеяў і сваіх прыходаў.

Пасля завяршэння дыпламатычнай місіі Дыега дэ Асэведа накіраваўся ў Рым, дзе епіскап звярнуўся да папы Інакенція III з просьбай арганізацыі пропаведзі каталіцкай веры сярод язычнікаў. Дыега спачатку выношваў праект місіянерства сярод куманаў (полаўцаў),

[8] Лакордер, Г. П. Указ. соч. С. 34-36.

племені на граніцах Венгрыі і ў сувязі з гэтым прасіў папу ў Рыме вызваліць ад займаемай пасады біскупа. Тым не менш папа палічыў унутраную місію больш важнай. Папа, адмовіўшы Дыега, накіраваў яго разам з Дамінікам у Лангедок у дапамогу цыстэрцыянцам, якія прапаведвалі каталіцкае вучэнне сярод прыхільнікаў альбігойскай ерасі (місіянерская дзейнасць у гэтым рэгіёне поўнасцю знаходзілася ў руках цыстэрцыянцаў, якім аднак не ўдалося дасягнуць поспехаў). У канцы 1204 г. абодва вярнуліся праз Сіто ў Паўднёвую Францыю і ўзгаднілі місіянерскую дзейнасць з папскімі легатамі (сярод іншых - з П’ерам дэ Кастэльно). Даведаўшыся пра няўдачу легатаў, спрабаваўшых схіліць да каталіцтва французскіх ерэтыкаў, біскуп Дыега прыняў радыкальнае рашэнне — распусціць сваю світу і стаць, падобна апосталам, вандроўным прапаведнікам, падарожнічаючы, як жабрак, толькі пешшу. Сустрэўшыся з імі ў Манпелье, епіскап, Дамінік, легаты, а таксама некаторыя святары накіраваліся з пропаведдзю ў Нарбон, Тулузу і іх ваколіцы, лічачы, што прыкладам дабравольна прынятай галечы і хрысціянскай пропаведдзю змогуць звярнуць ерэтыкаў.

Пры падтрымцы новага епіскапа Тулузы, цыстэрцыянцаў і былога трубадура Фальке (або Фулька) дэ Марсэля (аксітан. Folquet de Marselha, франц. Fo(u)lquet de Marseille), яны заснавалі ў 1206/1207 гг. у месцы Пруіль (фр. Prouille; аксітан. Prouilhe) паблізу Фанжо жаночы канвент Найсвяцейшай Маці Божай для новазвернутых катараў, якія ў першыя гады жылі па статуту цыстэрцыянцаў. Абшчына складалася з дачок дваран-католікаў і жанчын, вернутых з ерасі. Жанчыны выхоўвалі дзяцей, імкнучыся ахаваць іх ад уплыву катараў. У той час як Дыега вярнуўся ў Осму, дзе і памёр у 1207 г., Дамінік застаўся ў Паўднёвай Францыі і прысвяціў сябе свайму ўнутранаму закліку. Пешымі падарожжамі, па прыкладзе апостальскай беднасці, ён замест велічнага сядзення на кані, ад Пруйе і далей схіляў насельніцтва да каталіцкай веры.



Ён задумаў арганізаваць шырокую сетку вандроўных манахаў, якія б не замыкаліся ў сценах манастыра або абацтва, а падарожнічалі б па ваколіцах акругі. Гэтай праграме, якая жабрацтва рабіла формай пракармлення, з прычыны чаго прыходзіла ў супярэчнасць з дзеючым статутам, папа 17.11.1206 даў афіцыйную санкцыю.

15 студзеня 1208 г. быў забіты папскі легат П’ер дэ Кастэльно, што падахвоціла папу Інакенція III абвясціць крыжовы паход супраць альбігойцаў, які узначаліў граф Сімон дэ Манфор.

І ў перыяд ваенных дзеянняў Дамінік працягваў прапаведваць, пераважна ў Каркасоне і Фанжо. Тады і ўзнікла ідэя стварэння новага манаскага ордэну, члены якога маглі спалучаць «благадаць пропаведзі» (ці духоўны запал і стараннасць да вывучэння і пропаведзі Слова Божага) са строгім несцяжаннем і шчырым евангельскім жыццём.

Мала звестак аб тым, які менавіта ўдзел браў Дамінік у кампаніі супраць катараў. Уяўляецца відавочным, аднак, што ён рухаўся разам з передавымі атрадамі арміі

крыжакоў, дзейнічаючы на аснове паўнамоцтваў, атрыманых ад папскага легата Арнольда Амальрыка, абата Сіто, які аддаў загад аб знішчэнні ўсяго насельніцтва Безье, кіруючыся тым, што «Гасподзь Сваіх прызнае». Нават самыя вялікія апалагеты Дамініка з ліку яго біёграфаў прызнаюць, што ад яго часта патрабавалася выносіць прысуд падазроным у катарскай ерасі: вяртаць іх у лона Царквы або—калі гэта не ўдавалася зрабіць— пасылаць іх на вогнішча.

Нядзіўна, што Дамінік зрабіўся блізкім сябрам, даверанай асобай і дарадцам бязлітаснага ваеннага кіраўніка крыжаносцаў Сімона дэ Манфора і суправаджаў яго ў крывавым паходзе. Лічыцца таксама, што ён знаходзіўся з арміяй у бітве пры Мюрэ, дзе яго пропаведзі дапамаглі натхніць ваяроў Сімона дэ Манфора на перамогу над каралём Арагона. У 1214 г. Сімон дэ Манфор перадаў Дамініку «даход» ад прынамсі аднаго горада.

Да гэтага часу дзейнасць Дамініка і яго сувязь з Сімонам дэ Манфорам пераўтварылі яго ў нешта накшталт знакамітасці сярод крыжаносцаў. Так, у 1214 г. багатыя каталікі – грамадзяне Тулузы – перадалі ў дар тры пабудовы яму і яго ордэну братоў-прапаведнікаў. Праз год ён адмовіўся заснаваць свой ордэн у Каркасоне, відаць, з-за вельмі непрыязнай, нават адкрыта варожай крытыкі[9]. Замест гэтага ён пераехаў у Тулузу ў 1215 г. Тулузскі епіскап Фульк пажалаваў на іхні кошт частку дзесяціны, якую збіралі ў некалькіх падпарадкаваных яму прыходах, а ў ліпені 1215 г. кананічна зацвердзіў новую арганізацыю ў рамках епіскапства.



Тады жыццё манахаў па-ранейшаму абмяжоўвалася сценамі іх манастыроў, дзе яны займаліся фізічнай працай, рэлігійнай службай або малітоўным сузіраннем. Тыя нешматлікія з іх, якія валодалі нейкай вучонасцю, не мелі магчымасці перадаваць яе свету па-за межамі манстырскіх сцен. Дамінік прыняўся за выпраўленне сітуацыі і, як ён меркаваў, за барацьбу супраць катараў іх жа зброяй[10].

Восенню 1215 г. ён суправаджаў у Рым на IV Латэранскі сабор Тулузскага епіскапа Фулька, спадзеючыся атрымаць ад папы дазвол на заснаванне новага ордэну. На гэтым саборы папа Інакенцій III паўтарыў настойлівыя сцверджанні Дамініка аб неабходнасці тэалагічнай адукаванасці ў любым прапаведванні веры. Хаця сам ордэн ён афіцыйна пакуль не зацвердзіў, так як на адбыўшымся саборы было прынята рашэнне аб забароне ствараць новыя манаскія ордэны, але даў свой дазвол на выбар статута будучага ордэну. Праз паўгода новая інстытуцыя была замацавана 10 канонам IV Латэранскага сабору. Таксама Інакенцій узяў пад заступніцтва створаны Дамінікам манастыр у мястэчку Пруіль[11].

[9] Бейджент, М.; Ли Р. Указ. соч. С. 9-10.
[10] Library of Congress Cataloging in Publication Data.Hinnebusch, William A.The Dominicans. Dominicans-History. Copyright 1975 by the Society of St. Paul.
[11] Грамата ад 8 кастрычніка 1215 «Fratres et moniales S. Mariae de Prulliano». St. Dominic: Biographical Documents, ed. by Francis C. Lehner, O. P.

Дэвізам ордэну стала «Усхваляць, Благаслаўляць, Прапаведваць (Laudare, Benedicere, Praedicare). Аблачэнне па манаску строгае: белая туніка, скураны пояс з ружанцам і чорны плашч з чорнай палярынай і капюшонам.

Вясною 1216 г., вярнуўшыся ў манстыр у Пруйлі, Дамінікам быў выбраны, у якасці статута ордэна, статут св. Аўгусціна, т.я. падразумявалася стварэнне абшчыны не абмежаванай манастырскімі рамкамі. Епіскап Фульк, што вярнуўся з Рыма, аддаў у распараджэнне Дамініка і яго паслядоўнікаў 3 храмы, у тым ліку царкву святога Рамана ў Тулузе, пры якой быў заснаваны першы дамініканскі манастыр. Восенню 1216 г. Дамінік ізноў накіраваўся ў Рым, дзе папа Ганорый III зацвердзіў статут ордэну[12] і ўзяў яго пад асобую апеку (Рымскія папы былі пратэктарамі дамініканскага ордэну).

22 снежня 1216 г. булай Ганорыя III утвораны ордэн дамініканцаў. 26 студзеня 1217 г. папскай булай за ордэнам была замацавана назва братоў-прапаведнікаў. Імя братоў-прапаведнікаў, пад якім яны сталі вядомымі (Ordo Fratrum Praedicatorum), яны атрымалі абсалютна выпадкова. У час Латэранскага сабору, калі Дамінік быў у Рыме, папе Інакенцію спатрэбілася паслаць яму запіску. Ён загадаў свайму сакратару пачаць яе словамі: «Брату Дамініку і яго спадарожнікам»; затым, падумаўшы, ён загадаў напісаць: «Брату Дамініку і прапаведнікам, што з ім»; у рэшце рэшт пасля новых роздумаў ён напісаў: «Настаўніку Дамініку і прапаведнікам, што з ім». Гэтая назва іх вельмі ўзрадавала і яны адразу ж прысвоілі яе[13].



З заснаваннем дамініканскага ордэну і яўрэям паставілі ў абавязак слухаць пропаведзі аб прыняцці хрысціянства, заахвочваючы іх да гэтага пагрозамі і ўказамі каралеўскіх улад (у Арагоне – 1263 г., у Францыі – 1269 г., у Англіі – 1279 г., у Рыме – 1577 г., у Сіцыліі –1428 г., у папскіх уладаннях – 1584 г., у Аўстрыі – 1630 г.). Такі спосаб місіянерства канчаткова быў адменены ў Італіі толькі ў 1846 г.)[14].

Ганорый III назначыў Дамініка прапаведнікам пры папскім двары; гэтае назначэнне насіла часовы характар, але ў далейшым пасада магістра свяшчэннага апостальскага палацу (Magister Sacri Palatii Apostolici) стала пастаяннай і была замацавана за дамініканцамі (пасля рэформы 1968 г. пасада пачала называцца «багаслоў папскага дома»).

Пасля Вялікадня 1217 г. Дамінік адбыў у Тулузу, адкуль былі накіраваны прапаведніцкія місіі ў Іспанскія землі і ў Парыж. Цікава тое, што ўжо ў 1217 г. дамініканцы справакавалі ў Тулузе такую хвалю варожасці, што вымушаныя былі часова «знікнуць». Пры гэтым яны сталі рассяляцца па абіцелях далёка за рысай свайго горада— напрыклад, у Парыжы, Балоны і розных мясцовасцях Іспаніі. Яны часта займаліся даносамі, шпіёнілі, займаліся зборам кампраметуючых звестак. Займаючыся падобнай

[12] Була «Religiosam vitam» ад 22 снежня 1216 г. St. Dominic: Biographical Documents, ed. by Francis C. Lehner, O. P.
[13] История инквизиции. Происхождение и устройство. – Москва, 2001. – С. 276.
[14] Крещение насильственное // Электронная еврейская энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.eleven.co.il/article/12238 – Дата доступа: 15.04.2014.

справай, яны даказвалі сваю карысць для папы. Атрады вандроўных братоў, якія бадзяліся па дарогах акругі, ідэальна пасавалі для збору інфармацыі[15].

У адрозненне ад царкоўных іерархаў, браты Дамініка хадзілі басанож і жылі проста і сціпла, тым самым з'яўляючыся прыкладам строгасці і аскетызму, які патрабаваўся ад ранніх хрысціян і якога прытрымліваліся Айцы-заснавальнікі Царквы. Цікава, што зароку беднасці не было ў першапачатковым статуце ордэну. Першым штуршком зараджэння ордэну было дарэнне Селы і прадастаўленне епіскапам Фулькам часткі дзесяцінных даходаў; трошкі пазней пасля заснавання ордэну Дамінік не задумваўся прыняць ад Фулька тры царквы: адну ў Тулузе, другую ў Пам'ё, трэцюю ў Пюіларансе. Імкнучыся растлумачыць гэта, некаторыя даследчыкі гісторыі ордэну, кажуць, што заснавальнікі яго жадалі ўвесці беднасць у свой статут, але пабаяліся, каб падобная навіна́ не выклікала перашкод з боку папы пры зацвярджэнні статуту. Хаця дамініканцы былі адным з першых жабрацкіх ордэнаў, але не першай царкоўнай суполкай, якая дадала ў свой статут зарок беднаці. Першым быў рух Дуранда ў Іспаніі, які ўхваліў папа Інакенцій III (праўда, рух хутка сышоў на нішто). У святле гэтага факта вышэй названая трактоўка губляе сэнс. І мы ў праве верыць тым легендам, дзе Дамінік малюецца строга забараняючым сваёй брацііі ўжыванне грошай. З другога боку, мы ведаем, што ўжо ў 1217 г. браты спрачаюцца з агентамі Фулька па пытанні аб дзесяцінных даходах і дамагаюцца, каб усе цэрквы, якія налічваюць не менш шасці прычаснікаў, былі прызнаны прыходскімі і абкладзены гэтым падаткам. Толькі пазней, калі поспех францысканцаў паказаў магутную прывабнасць беднасці, гэты зарок быў прыняты і дамініканцамі на агульным сходзе 1220 г., а ў асноўныя правілы ордэну ён быў унесены толькі сходам 1228 г.; ад гэтага часу было строга забаронена братам-прапаведнікам набываць землі або арэндныя артыкулы, прадпісвалася не прасіць ніколі ні ў кога грошай і ставілася брату ў вялікі грэх захаванне пры сабе рэчы, мець якую яму было забаронена. Хутка ордэн строс з сябе гэтыя абмежаванні, але сам Дамінік служыў у гэтых адносінах прыкладам крайняй строгасці[16].

Больш таго, вандроўныя манахі Дамініка былі адукаванымі, спрактыкаванымі ў вядзенні вучонай спрэчкі, здольнымі зацягнуць катарскіх прапаведнікаў або каго заўгодна ў «тэалагічныя спаборніцтвы». Іх адзенне павінна быць простым, а ногі босымі, але з сабою яны заўсёды насілі кнігі.

У мінулым іншыя клірыкі таксама выступалі за вучонасць, але дзеля яе самой. Дамінік стаў першым дзеячам у гісторыі Каталіцкай Царквы, які адстойваў адукаванасць і эрудыцыю ў якасці неад'емнага сродку і інструмента прапаведніка.

У 1217 г. Дамінік сустрэўся ў Рыме з папам Ганорыем III, які перадаў у яго распараджэнне храм у імя св. Сікста разам з прыбудаванымі келлямі. Да гэтага часу належыць некалькі цудаў, якія ордэнская традыцыя прыпісвае Дамініку: уваскрашэнне



[15] Бейджент, М., Ли, Р. Указ. соч. – С. 12.
[16] Ли, Г. Ч. История инквизиции. Происхождение и устройство... С. 272.

працаўніка, загінуўшага пад абрушаным скляпеннем будуемага манастыра св. Сікста; уваскрашэнне памерлага дзіцяці; ацаленне смяротна хворага келара манастыра; памнажэнне хлеба і віна.

Па прапанове Ганорыя III у адноўлены манастыр св. Сікста было вырашана сабраць раскіданых па рымскіх манастырах манахінь, каб тыя жылі па адным статуце. Ордэну братоў-прапаведнікаў замест манастыра св. Сікста папа аддаў царкву і манстыр св. Сабіны на Авенцінскім узгорку.

У 1218-1219 гг. Дамінік здзейсніў першую візітацыю дамініканскіх манастыроў у Францыі, Іспаніі і Італіі. Пабываўшы у тулузскім манастыры св. Рамана і ў манастыры Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Пруілі, Дамінік прыбыў у Кастылію. У Сеговіі ён здзейсніў цуд, выклікаўшы дождж у час засухі, якая перашкаджала пачатку сяўбы. У памяць аб гэтым была ўзведзена капліца. З Сеговіі Дамінік накіраваўся ў Мадрыд, дзе Пятром Мадрыдскім, членам ордэну братоў-прапаведнікаў быў закладзены манастыр. Дамінік наведаў Паленсію, дзе заснаваў манастыр св. Паўла. Пасля вяртання ў Тулузу Дамінік накіраваўся ў Парыж, дзе правёў некалькі дзён у манастыры св. Якава, заснаваным раней пасланымі братамі. З гэтага манастыра, які налічваў 30 манахаў, ён накіраваў братоў на заснаванне ордэнскіх манастыроў у Ліможы, Рэймсе, Мецы, Пуацье і Арлеане.

У ліпені 1219 г. Дамінік прыбыў у Балонью, у заснаваны там вясной таго ж года манстыр св. Мікалая, адкуль накіраваў некалькіх членаў ордэну па гарадах Паўночнай Італіі: у Мілан, Фларэнцыю, Бергама, Верону, Асці, Фаэнцу і Брэшыю.



У 1220 г. на свята Тройцы тут адбыўся першы ўсеагульны сход (капітул) ордэну, калі кіраўніцтва ордэну было ўскладзена на Дамініка манахамі. Летам Дамінік накіраваўся з пропаведзямі па гарадах Паўночнай Італіі (Мадэна, Парма, Мілан, Крэмона, дзе сустрэўся са св. Францыскам Ассізскім). Да гэтага часу належыць стварэнне ім трэцяй галіны ордэну братоў-прапаведнікаў,якая аб’яднала цывільных, не звязаных зарокамі галучы і цнатлівасці, але якія знаходзліся пад духоўнай апекай святароў з дамініканскага ордэну. Першапачатковая назва аб’яднання цывільных—«Войска Ісуса Хрыста» (у далейшым тэрцыарыі[17]).

30 мая 1221 г. ў Балоньі адбыўся другі капітул ордэну, які замацаваў структуру ордэну братоў-прапаведнікаў, які быў раздзелены на 8 правінцый — Іспанію, Праванс, Францыю, Ламбардыю, Раманью, Тэўтонію, Венгрыю і Англію.

У гэтым жа годзе Дамінік сустрэўся ў Венецыі з папскім легатам Угаліна дэ Сіньі (у далейшым папа Рымскі Грыгорый IX), якога ён папрасіў паклапаціцца аб лёсе ордэну.

У 1221 г. Дамінік памёр ад ліхаманкі ў Балоньі. Яму было ледзь за пяцьдзесят. Згодна з завяшчаннем, Дамінік быў пахаваны пад манастырскім храмам св. Мікалая. Пазней з-за пашырэння манастыра стары храм быў знесены і заменены новым, а магіла

[17] «Fons sapientiae Verbum». St. Dominic: Biographical Documents, ed. by Francis C. Lehner.

Дамініка апынулася ў двары. У 1233 г. 24 мая астанкі былі пераненсены ў іншы храм. У ліпені таго ж года папа Грыгорый IX назначыў камісію з 3 чалавек для падрыхтоўкі матэрыялаў для кананізацыі Дамініка, якая адбылася 3 ліпеня 1234 г.[18]

Той факт, што кананізацыя Дамініка надыйшла не хутка пасля яго смерці, паказвае, што ён не так уразіў сучаснікаў, як завяраюць яго вучні. Яго вялікі паплечнік, або, дакладней, супернік, які памёр у 1226 г., быў кананізаваны ўжо праз 2 гады; малады францысканец Антоні Падуанскі памёр у 1231 г., а ўжо ў 1233 г. быў кананізаваны[19].

Пачатая ім справа, аднак, хутка пашыралася. На момант яго смерці існавала каля 20 манастыроў на тэрыторыі Францыі і Іспаніі. Члены ордэну былі вядомыя не толькі пропаведзямі, але і актыўным і руплівым штудзіраваннем тэалогіі. На 1224 г. прынамсі 120 дамініканцаў вывучалі тэалогію ў Парыжы. У 1227 г. папа пачаў да іх звяртацца за дапамогай «па справах веры». Па адмысловым даручэнні пантыфіка яны заняліся барацьбой з ерасямі, і іх дбайнасць у такіх справах рабіла іх незамяняльнымі ў царкоўнай структуры.

## СТРУКТУРА ОРДЭНУ ДАМІНІКАНЦАЎ

Перш чым гаварыць пра структуру ордэну трэба сказаць, што канчаткова яна была зацверджана Раймундам дэ Пеньяфортэ ў 1240 г., трэцім генеральным магістрам ордэну. А ў 1241 г. Канстытуцыя дамініканцаў уступіла ў сілу, куды была змешчана і структура ордэну.

Канстытуцыя была складзена цягам 1216-1220 гг.[20], пад непасрэдным кіраўніцтвам Дамініка дэ Гусмана. У аснову канстытуцыі, па патрабаванні Інакенція III, быў пакладзены статут св. Аўгусціна. Яна была падзелена на 2 часткі. Першая частка ўтрымлівала правілы, якія казалі, як браты павінны паводзіць сябе ў манстыры днём і ноччу. Пачатак яе распрацоўкі быў пакладзены яшчэ да афіцыйнага зацвярджэння ордэну братоў-прапаведнікаў, мабыць з моманту вуснага дазволу на арганізацыю ордэну папам Інакенціем III у 1215 г.

Трэба заўважыць, што дамініканцам першапачаткова не патрэбна была афіцыйна зацверджаная структура, так бы мовіць з-за малалікасці і адсутнасці цэнтраў дзейнасці. Толькі ў 1217 г., убачыўшы, як хутка ордэн пашырае свае межы, Дамінік пачынае работу над скліканнем генеральнага капітулу, дзе збіраўся аб'явіць аб зацвярджэнні структуры ордэну. Ён адбыўся 17 мая ў Балоны. На ім былі размеркаваны асноўныя пасады. Напрыклад, Дамінік дэ Гусман быў абраны генеральным магістрам ордэну. Таксама на гэтым капітуле прапаведнікі адмовіліся ад некаторых элементаў кананічнага жыцця, але

[18] Була от 3 ліпеня 1234 г. «Fons sapientiae Verbum». St. Dominic: Biographical Documents, ed. by Francis C. Lehner, O. P.
[19] Ли, Г. Ч. История инквизиции. Происхождение и устройство… С. 279.
[20] Constitutiones S. O. P.; P. Mandonnet-M. H. Vicaire, S. – Paris, 1938.

пакінулі ўсю маёмасць і даходы, і ў той жа час прыймалі практыку строгай беднасці. Што ўжо выклікае пытанні. Тут яны і адмовіліся ад назвы абацтва для сваіх манастыроў. А 30 мая 1221 г. ў Балоны на другім капітуле зацвердзілі структуру ордэну, якая затым і была змешчана ў канстытуцыю. У сваю чаргу другая частка, якая называлася secunda distinctio, апісвае іерархію пасад і іх выбары, лік і назвы правінцый.

Канстытуцыя, або, як яна была названа самімі братамі, Кніга Мытні, з'яўляееца незамяняльнай крыніцай у вобласці інфармацыі, датычнай паўсядзённага жыцця манастыроў і манаскіх абшчын, якія адносяцца непасрэдна да ордэну дамініканцаў[21].

У перыяд з 1228 па 1240 гг. Канстытуцыя зазнала змены, якія праводзіліся пад кіраўніцтвам двух наступных генеральных магістраў: Іардана Саксонскага і Раймунда дэ Пеньяфортэ. Яны заключаліся ў змяненні тэрміну дзеяння генеральнага магістра, яго абрання і тэрміну правядзення генеральнага капітула.

Канстытуцыяй прадугледжвалася[22]:

I. Падзел тэрыторыі дзеяння ордэну на 8 правінцый (спачатку): Іспанію, Праванс, Францыю, Ламбардыю, Раманью, Тэўтонію, Венгрыю і Англію.
II. Правінцыі знаходзіліся пад уладай правінцыялаў.
III. Правінцыі складаліся з асобных манастыроў, якія, у сваю чаргу, падпарадкоўваліся прыёрам.
IV. Кожны год у правінцыях праходзілі правінцыяльныя капітулы, на якіх абіралася 4 (пазней толькі 2 на правінцыю) здольных брата— дэфінітараў (diffinitores), якія павінны былі ўдзельнічаць у абранні правінцыяла ордэну. Яны павінны быць абранымі пры ўдзеле папярэдняга і перадпапярэдняга і прыёраў манастыроў. Тыя, каго выбрала большасць, і станавіліся diffinitors.
V. Гэтыя diffinitors павінны былі сачыць за парадкам у манастырах і правінцыях і ў выпадку нейкіх праблем адсылаць лісты генеральнаму магістру. Яны маглі нават, у выпадку неабходнасці, адхіліць прыёраў і правінцыялаў.
VI. Таксама diffinitors павінны былі разам з правінцыяламі назначаць месца правядзення наступнага правінцыяльнага капітулу.
VII. Кожны год (пазней кожныя 2 гады), абіраўся адзін diffinitors, як прадстаўнік генеральнага магістра, на генеральным капітуле ордэну; а таксама яго памочнік, якога называлі ipso jure. Ім даручалася дапамагаць і сачыць за работай генеральнага магістра.
VIII. На чале ордэну стаяў абіраемы правінцыяламі і асобымі выбаршчыкамі (diffinitores) пажыццёвы (пазней было усталявана на 6 гадоў) генеральны магістр.

[21] Лакордер, Г. П. Указ. соч. – С.127-130.
[22] Constitutiones S. O. P.; P. Mandonnet-M. H. Vicaire, S. – Paris, 1938.

IX. Абранне генеральнага магістра павінна было праводзіцца тайным галасаваннем, на якім прысутнічалі ўсе вышэй пералічаныя асобы

X. Таксама зацвярджалася штогадовае (пазней кожныя два гады) скліканне генеральнага сабору, прытым заканадаўчая ініцыятыва сабору абмяжоўвалася неабходнасцю, для дзейснасці той або інша меры, прыняцця яе паслядоўна трыма саборамі.

Іншымі словамі, вышэйшай уладай надзяляўся кіраўнік ордэну, які сустракаўся штогод на генеральным капітуле з делегатамі (diffinitors) і абранымі правінцыяльнымі кіраўнікамі (Provincials)[23].

Кожная вобласць складалася з манастыроў, узначаленых прыёрам, абраным непасрэдна братамі і правінцыяльным кіраўніком. Усе яны, акрамя генеральнага магістра, абіраліся на год.

Хаця кіраўніцтва ордэнам знаходзілася ў руках генеральнага магістра, ён абіраўся і яго ўлада абмяжоўвалася ў адпаведнасці з Канстытуцыяй папай Рымскім. Тым больш, што кожны святар-манах мог накіраваць ліст (скаргу) на правінцыяла або Кіраўніуа ордэну, непасрэдна Рымскаму папе. Нарэшце у Канстытуцыі існавала сістэма адклікання, каб выдаліць некампетэнтных або неахайных начальнікаў. Яна праводзілася ў рамках штогадовага капітулу, які склікаўся экстрэнна.

Падобная абшчынная структура кіравання садзейнічала развіццю Ордэну і яго поўнаму самакантролю. Так як на генеральных капітулах правінцыяльныя прыёры і браты праз сваіх дэлегатаў на роўных правах і з аднолькавай свабодай сумесна працавалі над развіццём місіі ордэну і яго належным абнаўленні. Асноўнае прызначэнне ордэну і вынікаючы з яго лад жыцця захоўваў сваю каштоўнасць для служэнння царквы ва ўсе часы[24]. 

Трэба сказаць, што структура ордэну была не цалкам аднароднай: побач з братамі-клірыкамі існавалі яшчэ браты-недухоўныя. І гэты складзены падзел забяспечваў падзел функцый унутры ордэну і, значыць, магчымасць для клірыкаў, усклаўшых усе матэрыяльныя клопаты на недухоўных, цалкам аддацца сваёй навуковай і прапаведніцкай дзейнасці.

## ІНКВІЗІЦЫЯ

У 1215 г., у разгар крыжовага паходу ў Лангедок, папа Інакенцій III склікаў IV Латэранскі сабор для прыняцця захадаў супраць ерэтыкоў і іншаверцаў ва ўсіх краінах[25].

[23] Constitutiones S. O. P.; P. Mandonne t- M. H. Vicaire, S. – Paris, 1938.

[24] Лакордер, Г. П. Указ. соч. С. 295.

[25] Слова інквізіцыя ў тэхнічным сэнсе ўпершыню ўжываецца на Турскім саборы 1163 года; інквізіцыя як сродак барацьбы з ератыкамі ўпамінаецца на III Латэранскім саборы ў 1179 годзе, калі папа Аляксандр III аб'явіў аб неабходнасці крыжовага паходу ў Лангедок.

Сабор прыняў пастанову аб барацьбе з ерассю (канон III), якая абавязвала свецкія і духоўныя улады нястомна прыгнятаць ерэтыкоў. Інакенцій III і шматлікія царкоўныя іерархі выдатна разумелі, што адна з прычын поспеху ерасі заключалася ў падзенні аўтарытэт духавенства, у прыватнасці ў разлажэнні старых манаскіх ордэнаў. Да таго манастыры, як правіла, падпарадкоўваліся хутчэй волі мясцовага сеньёра, чым Рыма. Рашэнне аб утварэнні інквізіцыі было прынята на гэтым саборы канчаткова.

Іквізіцыі было дадзена значэнне асобага следчага і судовага органу пры каталіцкай царкве для пераследвання ерэтыкоў. У якасці карнай меры пастанаўлялася: пазбаўленне грамадзянскіх правоў, забарона займаць грамадскія пасады, канфікацыя маёмасці і ў асаблівых выпадках— пажыццёвае турэмнае зняволенне. Суд над ерэтыкамі даручаўся епіскапам і іх упаўнаважаным. Пры гэтым указвалася, што прадстаўнікі ўлады абавязаны даваць штогод духавенству ўсе неабходныя сведчанні пра тых, што не жывуць як «усе астатнія грамадзяне».

У 1229 г. на Тулузскім саборы былі больш дакладна вызначаны функцыі епіскапальнай інквізіцыі: епіскапы павінны былі выбіраць у кожным прыходзе аднаго святара і двух паважаных свецкіх асоб, якія клятвенна абавязваліся вышукваць ерэтыкоў[26]. Але без ведаму епіскапа або ўпаўнаважанага было забаронена накладаць якое б то ні было пакаранне. Трэба адзначыць яшчэ новаўвядзенне: вернікам забаранялася мець Біблію і чытаць яе нават на лацінскай мове, што станавілася выключна прэрагатывай духавенства[27].



Аднак папства хутка расчаравалася ў эфектыўнасці гэтых метадаў барацьбы. Яно прыйшло да вываду, што ад свецкай улады і епіскапаў, якія па большай частцы былі звязаны з феадаламі ерэтыкамі, асаблівай стараннасці яно не дачакаецца. Таму Грыгорый IX вырашыў даручыць выкараненне ерасі дамініканскаму ордэну. Праўда, ордэн яшчэ да таго, як манаская інквізіцыя была зацверджана афіцыйна, па ўласнай ініцыятыве, ігнаруючы епіскапскую ўладу, пачаў барацьбу з ерасямі.

І наступным этапам ва ўстанаўленні інквізіцыі былі дзве булы Грыгорыя IX ад 20 красавіка 1233 г., якімі функцыі выяўлення ерэтыкоў і расследавання іх спраў выключаліся з распараджэння епіскапскіх судоў і перадавалася спецыяльным упаўнаважаным інквізітарам.

Першая з гэтых бул, « Ille humani generis», была звернута да епіскапаў Францыі. У ёй папа пісаў: «Бачачы, што нас паглынае віхор клопатаў і што вы з цяжкасцю можаце дыхаць пад уціскам прыгнятаючых вас трывог, мы знаходзім карысным аблегчыць ваша ярмо, каб вы маглі лёгка пераносіць яго[28]». Папа ў гэтай буле просіць прыязна прыняць пасланцоў і ва ўсім дапамагаць ім. Але «палягчэнне» заключалася ў пасылцы на падмену епіскапам дамініканскіх манахаў з неабмежаванымі паўнамоцтвамі па пераследванню

[26] Лозинский, С. Г. Святая инквизиция / С. Г. Лозинский. – Москва, 1927. – С. 118.
[27] Григулевич, И. Р. Инквизиция / И. Р. Григулевич. – Москва, 1985. – С.94.
[28] Цыт.: Тамсама – С. 97.

ерэтыкоў. Епіскапы, якія з’яўляліся кіраўнікамі сваіх епархій, не хацелі дзяліць уладу з жабруючымі манахамі, не кажучы ўжо аб тым, што яны самі адчувалі страх перад тайнай папскай паліцыяй, якая магла пры жаданні іх запісаць у лік ерэтыкоў. У тэорыі інквізіцыйным трыбуналам належала быць простым дадаткам да епіскапальнага трыбуналу. На справе ж улада епіскапаў паступова падрывалася.

Другая була, «Licet ad sapiendos», была звернута непасрэдна да інквізітараў, братоў ордэну прапаведнікаў. У ёй Грыгорый IX упаўнаважваў дамініканцаў: «Ва ўсіх месцах, дзе вы будзеце прапаведваць,— і ў выпадку, калі грэшнікі, нягледзячы на прымус, будуць працягваць абараняць ерась,— заўсёды пазбаўляць духоўных іх бенефіцый і пераследваць іх і ўсіх іншых судом, безапеляцыйна, заклікаючы на дапамогу свецкую ўладу, калі ў гэтым трапіцца патрэба, і спыняючы іх упартасць, калі трэба, пры дапамозе накладання на іх духоўных пакаранняў[29]». Далей папа аб’явіў аб утварэнні пастаяннага трыбуналу з манахамі дамініканцамі ў якасці яго членаў. Так фактычна была створана інквізіцыя.

У выніку інквізіцыйны суд набыў адзінства, якога яму не хапала, аддзяліўся ад рэгулярнага царкоўнага суда і атрымаў свае асобныя цэнтры. Важнейшы інквізіцыйны цэнтр знаходзіўся ў Каркасоне і Альбі.

Інквізітарам былі нададзены неабмежаваныя правы. Ніхто, акрамя папы, не мог адлучыць іх ад царквы за службовае злачынства, і нават папскі легат не адважваўся адхіліць іх, хаця б часова, без асаблівага на тое дазволу папскага прастолу.



А ў 1245 г. Інакецій IV[30] даў інквізітарам права дараваць адзін аднаму і сваім падначаленым усе праграшэнні, звязаныя з іх «прафесійнай» дзейнасцю. Яны вызваляліся ад паслушэнства сваім кіраўнікам па манаскаму ордэну, ім давалася права на свой одум з’яўляцца ў Рым з дакладам папскаму прастолу.

Дзякуючы папскаму эдыкту інквізітары дамініканцы атрымлівалі законныя паўнамоцтвы прызнаваць вінаватымі мяркуемых ерэтыкоў без якой бы то ні было магчымасці апеляцыі — і, такім чынам, па сутнасці, выносіць без доўгіх разбіральніцтваў смяротныя прысуды.

Цікава адзначыць, што іх дзейнасць, згодна папскай буле, была першапачаткова накіравана супраць духоўных асоб. Непазбежна, калі ўлічыць прыроду і маштаб закранутага пры гэтым адміністрацыйнага апарату, узніклі замінкі. Напрыклад, у 1248 г. сабор быў вымушаны пагражаць епіскапам недапушчэннем у іх уласныя цэрквы, калі яны не будуць згаджацца з прысудамі, якія выносіць інквізіцыя. І ў 1257 г. папа Аляксандр IV робіць інквізіцыю незалежнай, сканаваўшы неабходнасць кансультацыі з епіскапамі.

Успаміны Гіёма Пелісона, ураджэнца Тулузы, даюць каштоўную інфармацыю па ўсталяванні і дзейнасці інквізіцыі ў сярэдзіне XIII стагоддзя. Ён уступіў у дамініканскі

[29] Ли, Г. Ч. История инквизиции в средние века… С. 210.
[30] Лозинский, С. Г. Святая инквизиция… С. 138.

ордэн каля 1230 г. і ўжо ў 1234 г. стаў інквізітарам, нягледзячы на сваю параўнальную маладосць.

Перад сваёй смерцю ў 1268 г. ён стварыў манускрыпт, які распавядаў пра дзейнасць інквізіцыі ў Тулузе паміж 1230 і 1238 гг. Праз прыкладна тры чвэрці стагоддзя Бернарду Гі, аднаму з самых вядомых інквізітараў, было наканавана наткнуцца на рукапіс Гіёма і палічыць яго вартым таго, каб размножыць. Копія Бернарда захавалася ў архівах Авіньёна і пралівае святло на нягоды ранняй інквізіцыі. Гіём піша, што наступныя пакаленні дамініканцаў і іншыя каталікі маглі «даведацца, якія пакуты і колькі іх пацярпелі іхнія папярэднікі ў імя веры і Хрыста, маглі набрацца мужнасці супраць ерэтыкоў і ўсіх іншых няверных, і з тым, каб яны маглі быць гатовыя зрабіць—або, хутчэй, перанесці—столькі ж або больш, калі спатрэбіцца… Таму што пасля шматлікіх, нялічаных выпрабаванняў, перанесеных цярпліва, набожна і з добрымі вынікамі блажэнным Дамінікам і братамі, якія былі з ім у той зямлі, ісцінныя сыны такога бацькі не павінны асароміцца[31]…»

Каб прадэманстраваць тыя абставіны, з якімі сутыкнуліся інквізітары ў Альбі ў 1234 г., Гіём піша:

«Божы легат…зрабіў Арнольда Каталану, прыналежнага тады да манастыра ў Тулузе, інквізітарам супраць ерэтыкоў у епархіі Альбі, дзе ён мужна і бясстрашна прапаведаваў і стараўся з усіх сіл праводзіць расследванні. Аднак у той жа час веруючыя ерэтыкам практычна ні ў чым не прызнаваліся, а толькі адзінадушна адмаўлялі сваю прыналежнасць; тым не менш ён прыгаварыў двух жывых ерэтыкоў… і абодва былі спаленыя… Ён асудзіў і некаторых ужо памёршых людзей і загадаў вынесці целы іх і спаліць. Абураныя гэтым, жыхары Альбі паспрабавалі кінуць яго ў раку Тарн, але па патрабаванні некаторых сярод іх адпусцілі яго, пабітага, у разадраным адзенні, з акрываўленым тварам… Шматлікія нягоды напаткалі гэтых людзей у часы брата Фер'е, інквізітара, які схапіў і пасадзіў у турму велізарную іх колькасць, а таксама некаторых спаліў, і ў тым адбыўся справядлівы суд Божы[32]».



Адносна самой Тулузы Гіём скардзіцца, што «ў тыя дні каталікі былі ўстрывожаныя і занепакоеныя, а ў некалькіх месцах тыя, хто вышукваў ерэтыкоў, былі забітыя… правіцелі вобласці, разам са знатнымі дваранамі, гараджанамі і іншымі, абараняглі і хавалі ерэтыкоў. Яны збівалі, ранілі і забівалі тых, хто пераследваў іх… многія кепскія справы былі здзейснены на гэтай зямлі супраць царквы і вернікаў».

«У той жа час целы некаторых памерлых асоб, выкрытых у ерасі, перацягнулі праз увесь горад і спалілі. Увесь горад быў узрушаны і настроены супраць братоў з-за інквізіцыі і звярнуўся да графа. Ён наведаўся да інквізітараў і папрасіў іх, з-за павагі да яго,

[31] Цит. по: Бейджент, М., Ли, Р. Цепные псы церкви. Инквизиция на службе Ватикана… С. 14.
[32] Тамсама – С. 15.

прыпыніць сваю дзейнасць часова, спасылаючыся на свае нікчэмныя прычыны. Гэта яны адмовіліся зрабіць[33]».

Да лістапада 1235 г. ўсе дамініканцы і інквізіцыя былі сілай выгнаны з Тулузы гарадскімі консуламі. Консулы, як і належыць, былі адлучаны інквізіцыяй. Хутка пасля гэтага папа запатрабаваў, каб інквізітарам дазволілі вярнуцца. Зноў абаснаваўшыся ў горадзе, яны ўчынілі страшэнную хвалю гвалту.

Тут бачна, што інквізітары не спыняліся ні перад якімі б не было перашкодамі, нават смерць не замінала ім здзяйсненне «справядлівасці».

Народ жа рэагаваў на увядзенне інквізіцыі буйнымі хваляваннямі, якія ўзніклі ў Тулузе, Альбі, Нарбоне, Авіньёне, Каркасоне і г.д. У шэрагу месцаў гэтыя хваляванні суправаджаліся забойствам найбольш жорсткіх інквізітараў. Напрыклад, у 1233 г. было забойства інквізітара ў Германіі Конрада Марбургскага.

У 1252 г. папа Інакенцій IV выдаў булу «Ad extirpanda[34]» і тым самым аформіў стварэнне інквізіцыйнага трыбуналу, дазволіўшы ўжыванне катаванняў пры следстве. Была ўтварала ў епархіях спецыяльныя камісіі па барацьбе з ерассю з прававерных каталікаў, двух натарыусаў і двух або больш служачых, узначаленых епіскапам і двума манахамі жабрацкіх ордэнаў. Камісіям даручалася арыштоўваць ерэтыкоў, дапытваць іх, канфіскоўваць іх маёмасць. Прысуд выносілі епіскап і два манахі, яны ж маглі і мяняць склад камісій на свой одум. Па патрабаванні інквізітараў свецкія ўлады павінны былі катаваць тых, хто адмовіўся выдаваць ерэтыкоў. Свецкая ўлада і ўсе вернікі павінны былі садзейнічаць дзейнасці гэтых ужо па сутнасці інквізіцыйных трыбуналаў. Любое прамаруджванне ў выкананні загадаў інквізіцыі і супраціўленне яе дзейнасці магло прывесці віноўніка на вогнішча. 

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

У XIII ст. падчас бурлівага рэлігійнага жыцця, росту незадаволенасці афіцыйнай царквой, актывізацыі ерэтычных рухаў узніклі дзве новыя сілы, якія сказалі сваё важкае слова ў падрымку каталіцкай царквы - жабрацкія ордэны. Перагляд манаскага жыцця ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу пайшоў на карысць утвораным структурам і знайшоў падтрымку не толькі з боку іерархіі, але і паразуменне з нізавым святарствам і народнымі масамі. Ордэн дамініканцаў аказаўся найбольш прыдатным адказаць злобе дня: барацьбе з ерасямі, таму цалкам зразумела, чаму менавіта яму была даручана справа інквізіцыі.

[33] Тамсама – С. 16.
[34] 1243-1254 – SS Innocentius IV – Bulla ‘Ad_Extirpanda’ [AD 1252-05-15] // Documenta Catholica Omnia [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.documentacatholicaomnia.eu/01p/1252-05-15,_SS_Innocentius_IV,_Bulla_'Ad_Extirpanda',_EN.pdf

## БІБЛІЯГРАФІЯ:

### I. Крыніцы:

1. Була ад 3 ліпеня 1234 г. «Fons sapientiae Verbum». St. Dominic: Biographical Documents, ed. by Francis C. Lehner, O.P.
2. Була «Religiosam vitam» ад 22 снежня 1216 г. St. Dominic: Biographical Documents, ed. by Francis C. Lehner, O. P.
3. Грамата ад 8 кастрычніка 1215 «Fratres et moniales S. Mariae de Prulliano». St. Dominic: Biographical Documents, ed. by Francis C. Lehner, O. P.
4. Constitutiones S. O. P.; P. Mandonnet-M. H. Vicaire, S, Paris, 1938.
5. Library of Congress Cataloging in Publication Data. Hinnebusch, William A.The Dominicans. Dominicans-History. Copyright 1975 by the Society of St. Paul.
6. 1243-1254 – SS Innocentius IV – Bulla 'Ad_Extirpanda' [AD 1252-05-15] // Documenta Catholica Omnia [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.documentacatholicaomnia.eu/01p/1252-05-15,_SS_Innocentius_IV,_Bulla_'Ad_Extirpanda',_EN.pdf



### II. Даследванні:

1. Бейджент, М.; Ли, Р. Цепные псы церкви. Инквизиция на службе Ватикана / М. Бейджент, Р. Ли. – Москва, 2006. – 251 с.
2. Григулевич, И. Р. Инквизиция / И. Р. Григулевич. – Москва, 1985. – 448 с.
3. Лакордер, Г. П. Жизнь святого Доминика / Г. П. Лакордер. – Москва, 1915 – 302 с.
4. Ли, Г. Ч. История инквизиции в средние века / Г. Ч. Ли. – Т. I. – Москва, 1911 – 210 с.
5. Ли, Г. Ч. История инквизиции. Происхождение и устройство / Г. Ч. Ли. – Москва, 2001. – 276 с.
6. Лозинский, С. Г. История папства / С. Г. Лозинский. – Москва, 1986. – 382 с.
7. Лортц Йозеф. История Церкви, рассмотренная в связи с историей идей / Йозеф Лортц. В 2-х т. – Москва, 1999.
8. Крещение насильственное // Электронная еврейская энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.eleven.co.il/article/12238 – Дата доступа: 15.04.2014.